**Шаршунская інтэграваная сельская бібліятэка**



# *Па слядах вялікага песняра*

**Шаршуны, 2019**

***Шлях мой ня сцелецца сонцам і кветкамі,***
***Гладкай, павабнай ня лёг раўнiной,-***
***Памiж неўдалымi ўецца палеткамi,***
***Уецца зімой і вясной…***
***(“Шлях мой…” Я. Купала. 1913г.)***

Народны паэт Беларусі Янка Купала – ён шмат дзе бываў, шмат якія мясціны наведваў. Адны з іх нам усім добра вядомыя, а жыццё Народнага паэта апісана амаль да драбніц – Вязынка, Яхімоўшчына, Ляўкі, Бяларучы. А іншыя мясціны і сёння застаюцца ў невядомасці: Рубеж, Верацейкі, Раптуноўшчына, Здарэнне, Прытыкі, Ляшоўка, Калдукоўка, Корань,Сілінцы, Калісберг, Гайдукоўка. Кожная з гэтых мясцін асвечана Купалавым іменем. Амаль у кожнай з іх паэт некалі меў ці знаёмых, ці сваякоў, сустракаўся з імі, а ў некаторых мясцінах жыў і працаваў.




Штуршком да пачатку даследчай працы стала кніга- фота-альбом Анатоля Кляшчука “Беларусь. Зямля песняроў”. Выхад кнігі быў прымеркаваны да 130-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Я.Купалы і Я.Коласа. Ва ўступнай часцы кнігі, у звароце да чытачоў, аўтар напісаў так: “… я пакідаю Вам маячкі, што паспрыяюць у пошуку шматлікіх куточкаў, без якіх уяўленне пра зямлю паэтаў будзе няпоўным”

Пагартаўшы старонкі кнігі, я знайшла фотаздымкі добра знаёмых мне мясцін: Святыя крыніцы, Гайдукоўка, Калісберг, Радашковічы. Гэтыя населеныя пункты блізка знаходзяцца ад аграгарадка Шаршуны.




З пералічаных вышэй вёсак нас цікавяць вёскі Гайдукоўка і Кальсберг.

Яны адносяцца да тэрыторыі Рогаўскага сельскага савета, які у 2014 годзе пераіменаваны у Шаршунскі.

Мэтай было – сабраць у адзінае разрозненыя весткі пра наведванне гэтых вёсак Янкам Купалам.

Гэтыя вёскі стаяць неяк асобна ў ланцужку Купалавых мясцін.

Святыя крыніцы, Гайдукоўка – мясціны гэтыя добра знаёмы кожнаму жыхару Шаршун. Звілістая лясная дарога выводзіць нас на невялікую палянку, што знаходзіцца на правым беразе рэчкі Рубяжанкі. Тут, у акружэнні лесу, і стаіць вёсачка

Гайдукоўка. Гэта ўсяго ў нейкіх паўтара кіламетрах ад агр. Шаршуны і ў 10 км на захад ад Купалавых Акопаў. Сёння х вёсачцы гэта ўсяго 5 хат. Па стану на 29.01.20 г. тут зарэгістравана ўсяго адна гаспадарка з  дзвюмя жыхарамі.

Астатнія хаты – “летнія рэзідэнцыі”




нашчадкаў ужо ў трэцім пакаленні былых гаспадароў, якім пашчасціла сустракацца з Я.Купалам. І гэтым фактам з гісторыі вескі ганарацца сённяшнія гаспадары сядзіб.

Сваё імя вёсачка дала кар’еру па здабычы гліны. Ён знаходзіцца непадалёк. Кар’ер забяспечвае глінай цагляныя заводы г. Мінска і керамічны завод  п. Радашковічы.

Вядомы краязнаўца, Уладзімір Содаль, у сваёй кнізе “Пуцявінамі  сейбіта” апісвае сваю сустрэчу з Антонам Грудзінкам – старым лясніком, які жыў у Гайдукоўцы з самага нараджэння і меў шчасце сустрэчы Я.Купалам.

Па словах А.Грудзінкі, Гайдукоўка некалі належыла Андрэю Снітку, цесцю Тарашкевіча, што напісаў першую беларускую граматыку для школ. Вёска і ў той час была невялічкая. Жылі тут  апрача Грудзінкаў яшчэ Тарасевічы і Булды. Жылі з зямелькі і з лесу. У лесе было шмат ягад і грыбоў,

дзічыны рознай. Была тут такая глухамань, што не кожны мог знайсці нашы хаты, а знайшоўшы, падступіцца. Зямля вакол была закрынічаная і забалочаная. Але спакваля людзі абжылі гэты кут: грэблі дзе трэба наслалі, падсыпалі дарогі. Па успамінах дзеда А.Грудзінкі, нават мядзведзі тут туліліся.

Можа таму і да цяперашняга часу нашу мясцовасць называюць "мядзвежым вуглом".

На Рубяжанцы Сніткі паставілі млын з пытлем, з валюшом. І сюды пацягнуліся сялянскія вазы з суседніх вёсак – змалоць зерне, пачасаць воўну.

Пасля Гайдукоўку ўзялі ў арэнду Раманоўскія, Фэлька з Актавіяй (Вольгай). Іх сын Юлій быў жанаты на роднай сястры паэта Леакадзіі. У далёкім 1919 годзе тут, у сваёй сястры, гасцяваў Купала. А дакладней 22 і 23 жніўня. Гэта быў неспакойны час. Ішла Грамадзянская вайна.

Тут, ў Гайдукоўцы, паэт напісаў два вершы: "Груган" і "Беларускія сыны".

Яшчэ звесткі пра наведванне вёскі паэтам я знайшла ў кнізе вядомага даследчыка творчасці Я.Купалы Янкі Шарахоўскага "Пясняр дум народных".




**ГРУГАН.**

Кожнай вясны, як выхожу
Свой засяваці загон,
Чорны груган вылятае,
Знекуль – з няшчасных старон.

Крылле, як вехі, разняўшы,
Страшны затачвае круг:
Крумкае, гракае жудка,
Жудкі сплятае ланцуг.

Сумныя думы абсядуць,
Ног не павырваць з раллі.
Млее рука, а сявалка
Цісне і цісне к зямлі.

Восень як прыйдзе, і з поля
Выйду збіраці сяўбу,-
Гэты ж груган вылятае,
Гэту ж вядзе варажбу.

Звісне над хмарамі зданяй,
Воч не спускае з мяжы,
Косці пасеяны ліча,
Ліча людзей і крыжы.

Гляну, і сілы слабеюць,
К думам сціскаецца жах,
Сціснецца сэрца ад болю
Ноч замігціць ў вачах.

Гэтак вось кожны год вечна ,
У поле як толькі іду,
Знекуль груган вылятае
І наклікае бяду.

1919г.

**БЕЛАРУСКІЯ СЫНЫ.**

Па беларускім бітым шляху,
Б'ючы ў кайданавы званы,
Брыдзе чужынец, а з ім побач
Хто? – Беларускія сыны!

У беларускім вольным краі,
З ярэмнай збрыўшы стараны,
Царыць чужынец, аў паслугах
Хто? – Беларускія сыны!

Над беларускай беднай хатай,
Як полка вырвана з труны,
Вісіць чужы сцяг, а трымае
Хто? – Беларускія сыны!

У Беларусі спеў чужацкі,
Як над калыскай груганы,
Крумцяць чужынцы, а іх складам
Хто? Беларускія сыны!

На беларускім буйным полі
З вясны да новае вясны
Растуць крыжы, а пад крыжамі
Хто? – Беларускія сыны!

1919 г.

Дата напісання верша 22 жніўня 1919 года. Верш арыгінальны і вельмі патрэбны для свайго часу. У 1919 годзе была белапольская акупацыя. Думаецца, што роздумы пра гістарычныя шляхі Беларусі і нарадзілі ў Купалавай душы гэты верш, а гайдукоўская рэчаіснасць з яе дрымотнай гісторыяй, з напамінам пра гайдукоў – і не толькі пра прыганятых, а найперш пра няскораных: гайдукамі калісь называлі і паўстанцаў – паспрыялі напісанню гэтага твора. Шмат іншых назіранняў вынес паэт з Гайдукоўкі.

Ён хадзіў ляснымі сцежкамі, слухаў подых траў, пошум лесу, бульканне ручаёў і ручаінак.Усё пачутае і убачанае тут пераўвасаблялася ім у дзівоснай прагажосці песні-вершы, песні-думы.

Антон Грудзінка прыпамінае тую сустрэчу з паэтам так. Было гэта ўлетку. Я да ракі ішоў. Бачу – вогнішча на беразе рэчкі шугае. А ля яго –Купала, Юлік, яго брат Юзік і парабак. Юлік пазнаў мяне, паклікаў да вогнішча і сказаў: “Антось, заспявай нашаму Янку, ён гэта любіць.” Я заспяваў, але ён не вельмі ўпадабаў мае спевы. Папрасілі праспяваць парабка. Той пагадзіўся. Янка паслухаў і кажа: “Вось гэта нічога. Тут ёсць наша нота, наш напеў, болей дзельная”.



Рэшткі былой запруды млына

Пакуль быў жывы Антон Грудзінка, у Гайдукоўку часта наведваліся турысты, каб пахадзіць сцежкамі песняра і паслухаць успаміны дзеда Антося. Ён заўсёды ўзгадваў гэтую сціплую сустрэчу з песняром, паказваў хатнішча, дзе жылі Раманоўскія, у якіх гасцяваў паэт і прыпамінаў радкі з верша “А хто там ідзе?”. Чаму іх запомніў? – бо гэта ж пра ўсіх нас бедакоў пісалася… Купала хацеў, каб усім добра было, каб усе роўныя былі.

Сёння аб мінулым вёскі Гайдукоўка напамінаюць толькі рэшткі запруды млына, што стаяў на высокім беразе рэчкі Рубяжанка, куды заходзіў паэт, каб палюбавацца прыгажосцю навакольных мясцін.



Гайдукоўка сёння

Млын яшчэ доўга служыў людзям. У гады Вялікай Айчыннай вайны тут малолі муку для партызанскай брыгады “Штурмавая”, што дыслацыравалася ў навакольных лясах.

Калі прайсці лясной дарогай, што ідзе ад вёскі ў бок кар’ера, то на ўзбочыне дарогі натыкаешся на рэшткі старога, парослага мохам падмурка з камянёў – напамін аб тым, што калісь тут былі гаспадарчыя пабудовы Раманоўскіх. Захаваліся і рэшткі прысадаў, што вялі да іх дома.

**КАЛІСБЕРГ**

Яшчэ адна мясціна натхняла Янку Купалу ў 1919 годзе на творчыя ўзлёты.

Гэта мясціна – вёска Калісберг. У канцы XIX - пачатку XX стагоддзя фальварак Калісберг, гэдак жа як і Гайдукоўка, належыў беларускаму краязнаўцу, гісторыку і археолагу Андрэю Канстанцінавічу Снітку (1866-1920). У яго бытнасць, і ў дарэвалюцыйны час , у Калізбергу і ў Радашковічах пабывала даволі шмат вядомых вучоных і дзеячаў культуры:

рускі славіст, акадэмік А.А.Шахматаў, беларускі этнограф і археолаг І.А. Сербаў, кампазітар Л.Рагоўскі, які ўпершыню выканаў у гэтым доме толькі што ім напісаную музыку да верша Я.Купалы "А хто там ідзе?"

Фальварак Калісберг, як і Гайдукоўку, арандавалі Раманоўскія.

Гэтыя мясціны знаходзяцца не вельмі далёка адна ад адной. Вось чаму ўжо 24 жніўня мы бачым паэта ў гэтым кутку нашай зямлі.

Для нас цікавым з'яўляецца той факт, што неаднойчы ў гэтым фальварку меў прытулак Народны паэт. 1919 год – год акупацыі Беларусі войскамі буржуазнай Польшчы. Я.Купала мусіў пакінуць Мінск і некаторы час жыў у Калісбергу. Як успамінала сястра паэта, Леакадзія Дамінікаўна: "Ён не мог тады бавіць час, ён пісаў, як і пісаў ён усюды". Падцвярджэннем гэтых слоў служаць зробленыя паэтам у аўтографе верша "На

нашым…” паметкі: “Калісберг. 28.VIII.1919”, а таксама пад чарнавым аўтографам “Мая навука” ёсць паметка: “Калісберг. 29.VIII.(19)19 г.”

У Калісбергу ім напісаны вершы: “На нашым полі”, “З павяўшай славы” і добра вядомы ўсім верш "Мая навука”.

Мне мудрасці кніжнай ня даў Бог пазнаці,
Мой бацька ня мог даць раскошаў такіх –
Наўчыўся я слоў беларускіх ад маці
І дум беларускіх бяз школы і кніг.
Ад самай красы маіх дзён невясёлых
Настаўнікам быў беларускі абшар;
Усходы палеткаў і гоманы ў сёлах
Навуку сваю мне прыносілі ў дар.
Душу акрыляль прыгожасьці сьвету,
Пагонях пад небам лунала яна,
Купалася ў сонцы вясёлкай расьпетай,
Сама, як вясёлка, як казка-вясна.
І п’яная чарамі, п’яная песьняй,
Як сон заварожаны райскіх мясьцін,
Шаптала мне дзівы цьвітучых прадвесьняў
І песьняй лілася з пазодам часін.
Бурлівая рэчка і млын гутарлівы
Адмерным, раскоцістым плюскатам вод
Складалі мне рытму мастацкія зьвівы,
Парадквалі складаў раскоцісты ход.
Цяністыя бітага шляху прысады,
У вырай лятучыя гусяў шнуры,
Гармонію ўводзілі ў песенным складу,
Сачылі нязгоднай зваротак ігры.
Зялёнае поле рунеючым збожжам,

Цьвітучая ў сонечны цьвет сенажаць
Мне песьню квяцілі ўзорам прыгожым,
Вучылі, як словы ў вянок завіваць.
Ад шопату сьпелых пшанічных калоссяў,
Ад шэлесту лісьцяў узьмежных ігруш
Музычнае водгулле ў песьню злілося,
Злівалася з жальбамі скрыўджаных душ.
Шум бору адвечнага  казкавым сказам
Нашэптваў смутную повесць жыцьця
І песню ў шум-гоман захопліваў разам,
Заснуўшыя думы будзіў зь небыцьця.
А сонца, скрозь сеючы іскры па сьвеце,
Мне песьню іскрыла нябесным сьвятлом,
А вецер, што ў полі рве дзёрны і сеці,
Даў волю і крыльле лунаці арлом.
Каса і сякера, і цэп малацьбітны
Магутную волатаў сілу далі;
Марозы і сьпекі далі гарт нязбытны –
Мна песьню, як звон, як пярун, адлілі.
Так іншай ня знаўшы навукі і школы,
У пацёмках шукаў і знайшоў Божы дар;
Цяпер маймі скарбамі – думы-саколы,
Цяпер беларускай я песьні ўладар.

Калісберг сёння – звычайная вёска, дзе пражывае 40 жыхароў. Дзе нічога не напамінае пра бурлівае культурнае жыццё канца  XIX  пачатку XX стагоддзя.